*З вопыту работы*

# ІНТЭРНЭТ-ТЭХНАЛОГІІ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРЫ

Сёння ўсё большае значэнне набывае прыўнясенне ў адукацыйны працэс інтэрнэт-тэхналогій, сярод іншых і такой, якая прапануе разнастайныя магчымасці для рэалізацыі сумеснай работы пры навучанні. Гэтыя тэхналогіі дазваляюць зрабіць урокі больш эфектыўнымі, бо пры іх выкарыстанні лёгка арганізаваць асобасны падыход у навучанні. Розныя сэрвісы даюць магчымасць выконваць індывідуальную і калектыўную работу з прэзентацыямі, малюнкамі, картамі, стужкамі часу і інш.

Web 2.0 тэхналогіі адкрываюць прынцыпова новыя магчымасці для дзейнасці, у якую лёгка ўключаюцца людзі, што не валодаюць спецыяльнымі ведамі ў галіне інфармацыйных тэхналогій:

• у выніку распаўсюджвання Web 2.0 тэхналогій у свабодным доступе аказваецца вялікая колькасць матэрыялаў, якія могуць быць выкарыстаны ў вучэбных мэтах;

• Web 2.0 тэхналогіі спрашчаюць працэс стварэння матэрыялаў і публікацыі іх у сеціве, калі кожны можа не толькі атрымаць доступ да лічбавых калекцый тэкстаў, фатаграфій, малюнкаў, музычных файлаў, але і ўдзельнічаць у фарміраванні ўласнага сеціўнага кантэнту;

• Web 2.0 тэхналогіі дазваляюць арганізаваць асабістую прастору дзейнасці навучэнца.

Адной з галоўных пераваг прапанаваных для разгляду сэрвісаў з’яўляецца рэалізацыя іх пры выкарыстанні ў вучэбным працэсе двух галоўных дыдактычных прынцыпаў: нагляднасці і інтэрактыўнасці. Прымяненне наглядных і тэхнічных сродкаў навучання не толькі спрыяе эфектыўнаму засваенню адпаведнай інфармацыі, але і актывізуе пазнавальную дзейнасць вучняў, развівае ў іх здольнасць звязваць тэорыю з практыкай, фарміруе навыкі тэхнічнай культуры, павышае цікавасць да навучання і робіць яго больш даступным.




**Плэйкаст.** Уладзімір Караткевіч. “Лісце каштанаў”.




**“Віртуальная сцяна”.** “Па праве памяці…”.

Web-сэрвіс Padlet, прыклад якога прадстаўлены ніжэй, прызначаны для стварэння і напаўнення кантэнтам віртуальнай сцяны з магчымасцю сумеснага рэдагавання. Гэты сэрвіс дазваляе ствараць сцены мультымедыйных (відэа, тэкст, фота, графіка) нататак, якімі можна падзяліцца з іншымі, сумесна працаваць, размяшчаць работы на старонках сайтаў, блогаў. Мультымедыйныя элементы можна падгрузіць са свайго камп'ютара ці з вядомых інтэрнэт-сэрвісаў.

*Магчымасці арганізацыі групавой работы ў сэрвісе.* Ёсць магчымасць для выкарыстання ў калектыўнай рабоце. Калі вамі дазволена гэтую сцяну рэдагаваць, то па спасылцы гэта можна зрабіць. Узроўні доступу наладжваюцца стваральнікам старонкі: толькі праглядаць; дадаваць матэрыялы; поўнае рэдагаванне.

*Магчымасці сэрвісу для арганізацыі работы на ўроку.* Кожны настаўнік можа выкарыстоўваць магчымасці сэрвісу для вырашэння канкрэтных задач у сваёй прадметнай галіне. Гэты сэрвіс можна выкарыстоўваць: для планавання праектаў; збору матэрыялаў па канкрэтнай тэме; стварэння інтэрактыўнага аповеду пра вядомую асобу.

*Што можна стварыць пры дапамозе дадзенага сэрвісу.* Прадставіць вынікі сумеснага даследавання; вывучаючы біяграфію і творчасць пісьменніка (паэта, гістарычнай асобы), зрабіць віртуальную дошку па фактах біяграфіі, напісаным творам (для пісьменнікаў, паэтаў); скласці віртуальныя "Нататкі падарожнікаў" (матэрыялы экскурсій, наведванняў тэатраў, выстаў, музеяў, вандровак і сустрэч з цікавымі людзьмі), з мультымедыя, фота-, відэасправаздачай і каментарыямі.

*Заданні вучням у гэтым сэрвісе:* пошук інфармацыі; пляцоўка для размяшчэння вучэбнай інфармацыі; калекцыя фота-, відэаматэрыялаў для прагляду вучнямі па вывучанай тэме; апорны канспект мультымедыйнага ўрока са спасылкамі на матэрыялы.

*Дзе можна дзяліцца матэрыяламі сэрвісу.* Створанымі "сценамі" мультымедыйных (відэа, тэкст, фота, графіка) нататак можна падзяліцца з іншымі, сумесна працаваць, размяшчаць работы на старонках сайтаў, блогаў, вікі.

Такая праца з'яўляецца каштоўным прыкладам як самастойнай працы, так і ў групавой работы: *школьнікі* вучацца збіраць матэрыял з розных крыніц, сістэматызаваць яго, прадстаўляць перад слухачамі і гледачамі. Акрамя таго старшакласнікі развіваюць свой інтэлектуальны патэнцыял, узровень інфармацыйна-камунікацыйнай кампетэнтнасці.

"ПА ПРАВЕ ПАМЯЦІ…"

## ТЭХНАЛАГІЧНАЯ КАРТА "віртуальнай сцяны" да ўрока беларускай літаратуры

| | |
|---|---|
| **Прадмет** | Беларуская літаратура |
| **Клас** | 9 – 11 |
| **Аўтар "віртуальнай сцяны"** | Казачэнка Ірына Рыгораўна, вучні 11-га класа |
| **Сэрвіс** | Web 2.0 Padlet |
| **Назва, спасылка на "віртуальную сцяну"** | "Па праве памяці…"; https://padlet.com/kristina_fink/okwxaagi2lgq |
| **Мэта ўрока** | садзейнічаць паглыбленню ведаў пра літаратуру, прысвечаную падзеям Вялікай Айчыннай вайны; пазнаёміць з дакументальнымі творамі гэтага перыяду; спрыяць развіццю творчага патэнцыялу вучняў і іх інфармацыйна-камунікацыйнай кампетэнтнасці пры рабоце з інтэрнэт-сэрвісам Padlet, удасканаленню выразнага чытання; спрыяць выхаванню патрыятычных пачуццяў старшакласнікаў, пачуцця непрымання вайны |
| **Прымяненне "віртуальнай сцяны"** | "Віртуальную сцяну""Па праве памяці" можна выкарыстоўваць на ўроку беларускай літаратуры на III ступені навучання і выхавання і ў пазакласнай працы па беларускай літаратуры |
| **Тэхнічныя дадзеныя "віртуальнай сцяны"** | Выкарыстаны фотаздымкі, відэафайлы, аўдыяфайл, спасылкі на web-старонкі (плэйкаст), тэкставы матэрыял (план-канспект) да ўрока |
| **Неабходнае абсталяванне** | камп'ютар, мультымедыйны праектар, падключэнне да інтэрнэту |
| **Дзейнасць вучняў** | слухаюць выразнае чытанне вершаваных радкоў А. Вярцінскага "Агонь" у суправаджэнні аўдыяфайла, падбіраюць асацыяцыі да слова "вайна";<br>глядзяць відэаролік пра пачатак Вялікай Айчыннай вайны, даюць гістарычны каментарый;<br>слухаюць паведамленне пра абарону Брэсцкай крэпасці, глядзяць відэаролік "Абарона Брэсцкай крэпасці. 1941";<br>слухаюць паведамленне пра кнігу ўспамінаў "Ніколі не забудзем", праглядаюць буктрэйлер на кнігу;<br>слухаюць паведамленне пра стварэнне кнігі "У вайны не жаночае аблічча" Святланы Алексіевіч; падбіраюць прыметнікі для складання сінквейна "Вайна" (работа ў групах);<br>слухаюць паведамленне пра кнігу "Я з вогненнай вёскі" А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка; падбіраюць дзеясловы для складання сінквейна (работа ў групах);<br>навучэнка чытае на памяць урывак з аповесці "Лісце каштанаў" У. Караткевіча; чытанне суправаджае плэйкаст;<br>складаюць сінквейн;<br>чытаюць урыўкі з міні-сачыненняў, створаных да ўрока;<br>атрымліваюць дамашняе заданне |
| **Дзейнасць настаўніка** | уводзіць фота, відэа- і аўдыяматэрыял па тэме;<br>тлумачыць заданні этапаў урока, кантралюе іх выкананне;<br>тлумачыць дамашняе заданне |
| **Спасылкі на рэсурсы** | https://www.youtube.com/watch?v=40Uc-1Gg3-w<br>https://www.youtube.com/watch?v=dqj87GLqY7Y&feature=player_embedded<br>https://www.youtube.com/watch?v=paxltML8QG0<br>http://www.playcast.ru/view/10556709/1e30898521afe2b7fd5a0302061aa40a39dee51fpl |

**Ірына КАЗАЧЭНКА,**
настаўнік-метадыст беларускай мовы і літаратуры
Лельчыцкай раённай гімназіі.